"Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць..."

МАЛАНКА

Бюлетэнь–газета Іркуцкага таварыства Беларускай культуры ім. Я.Д. Чэрскага



№8 (43) **ЖНІВЕНЬ 2003 год** накалд **500** асобнікаў

У ЖНІЎНЕ НАРАДЗІЛІСЯ СЯБРЫ НАШАЙ СУПОЛКІ

1 жніўня нарадзілася Надзея Скульбідэнка; 2 жніўня – Аліеў Раміс; 4 жніўня – Лісіцына Таццяна, Лісіцына Наташа; 3 жніўня – Забродская Ларыса Пятроўна; 6 жніўня – Дронава Яўгенія Аляксееўна; 8 жніўня – Краснова Ніна Ігнатаўна, Шынкароў Іван; 9 жніўня – Глухаў Міхась Іванавіч; 11 жніўня – Пацэвіч Сяржук; 13 жніўня – Марыя Фядосаўна Казіначыкава; 14 жніўня – Дульчэўская Алена; 17 жніўня – Лісіцын Андрэй Канстанцінавіч; 18 жніўня – Вадарацкі Віктар; 20 жніўня – Пыхцеева Кася; 24 жніўня – Банчук Мікалай Міхайлавіч; 25 жніўня – Корзун Ала Антонаўна; 26 жніўня – Гусева Галіна Асатаўна.

Шаноўныя спадарыні і спадары! Ад імя Рады ІТБК і Рэдакцыі «Маланкі» віншуем Вас з Днём нараджэння! Жадаем моцнага здароўя, поспехаў у справах, асабістага шчасця, добрага настрою і трывалага Кахання!

Спадзяёмся, што Вы заўжды будзіце прымаць актыўны ўдзел у справах нашай суполкі, дый на карысць нашай любай Бацькаўшчыны.

Усяго Вам найлепшага!

Падзеі і справы ІТБК

Вот и лето наступило..., да уж, пожалуй, и прошло, а мы об отдыхе мечтали, да видно за работой всё прозевали!

Жители Сибири всегда ждут с нетерпением прихода лета. Ведь, согласно традиции, оно даёт надежду о поездке в отпуск. Именно поездки, так как сибиряки в основном народ «пришлый», приехавший в этот удивительный край кто силком, а кто и за длинным рублём. Правда в наше время, длинный рубль, говорят, только в Москве водится. Но всё равно уехать из Сибири на «Запад», где яблоки на деревьях растут, мечтает каждый сибиряк.

Члены нашего Товарищества по возможности также стремятся уехать на свою историческую Родину. Конечно, те, кто имеет родственников, а может и родителей, или родных братьев и сестёр, даже об этом и не раздумывают, деньги копят с прошлой осени. Другие вольны, выбирать ехать ли в Беларусь или на Юг, а у кого возможности побольше так и за границу (имею в виду дальнее зарубежье).

Обычно летом наше Товарищество не планирует никаких дел. Раньше мы проводили Купальле и ... в отпуска. Однако вот уже второй год подряд лето мы используем также активно, как и другие поры года. Это отчасти объясняется и тем, что активистов ИТБК стало значительно больше, поэтому кто в отпуск, а кто уже и приехал, а некоторые так никуда и не уезжали. А с увеличением активных членов Товарищества вырастают и возможности, да и честно говоря, авторитет активного национально-культурного общества, который мы заработали своими делами, шагает впереди нас и заставляет проявлять всё большую инициативу.

Члены нашего Товарищества в летний период (кроме проведения сразу в трёх местах «Купальля» – в Иркутске, в Черемхово, и в Тургеневке – об этом мы уже рассказывали в №42 «Маланки» и кое-что расскажем в этом номере) присутствовали на различных собраниях и заседаниях проводимых Администрациями области и города, Советом НКО и т. п.

В середине июля была организована этнографическая экспедиция в Тулунский район Иркутской области, что находится приблизительно в 350 километрах на запад от города Иркутска. Экспедиция превзошла все ожидания. Оказывается, в Тулунском районе 124 села было образовано белорусскими переселенцами во время Столыпинской реформы. Правда, позже во время Хрущёвских реформ прошло «укрупнение» колхозных хозяйств, что привело к насильственной ликвидации большей части «небольших» (от50 до 100 дворов) деревень. В самом Тулуне (население города 42.000 человек) белорусы и их потомки встречаются на каждом шагу. Это просто удивительно и очень интересно: типичные белорусские лица, приятный белорусский говорок. Чем не какой-нибудь провинциальный город (например, Поставы или Браслав) в нашей Беларуси? Более подробные материалы об этой экспедиции мы опубликуем в следующих номерах нашего бюллетеня.

Хочется также сказать несколько хороших слов о нашем Председателе Иркутского городского отделения ИТБК – Бизиковой Татьяне Александровне, которая была избрана на эту должность 30 мая 2003 года. Приятно, что избирая её мы не ошиблись. Татьяна всё лето посвятила активной работе в ИТБК. Она не только решала организационные вопросы текущей работы Товарищества, но и в буквальном смысле этого слова решила преобразить Зал заседаний Рады в нашем Офисе на Чехова,2 – сделать его более белорусским!

Вот такое это лето!

Алег Рудакоў.

ВОДГУКІ СЯБРОЎ

КУПАЛЬЛЕ НА АНГАРЕ – ЧУДЕСА КУПАЛЬСКОЙ НОЧИ

Белорусы Иркутска в ночь с субботы на воскресенье отпраздновали Купалье в Архитектурно-этнографическом музее "Тальцы". Символично, что белорусский праздник прошел именно в Тальцах - в прошлом году этот комплекс памятников русской и бурятской архитектуры признан лучшим в России музеем под открытым небом.

Когда активистки молодежного клуба "Крывічы" и артистки фольклорного ансамбля "Ленушка" рассаживались в автобусе, мне показалось, что участниц на празднике будет больше, чем зрителей, а все действо будет исключительно девичьим. Мои опасения оказались напрасны – парни приехали на автомобилях; массовости празднику придали и гости из ближайшего по Байкальскому тракту дачного поселка.

Прибыв вечером в Тальцы, женщины стали накрывать на столы (планировались "беларускія бяседы", то бишь застолье), а девушки отправились плести венки.

Всю ночь по Тальцам разгуливали люди в белорусских национальных костюмах и девушки в венках.

За праздничным столом белорусов Иркутска поприветствовал этнический белорус, заместитель председателя законодательного собрания Иркутской области Геннадий Истомин. Свой тост произнес и депутат ГосДумы Юрий Курин, для которого наличие и активная деятельность в течение семи лет Иркутского товарищества белорусской культуры стали недавним открытием. Угощаясь на крутом берегу Ангары, гости праздника смогли насладиться и белорусскими песнями - от простейших народных до арий из белорусских опер - и отгадыванием белорусских загадок, и "белорусским караоке" - пением частушек по заготовленным текстам.

Когда стемнело, на обрыве с факелом появился Князь Купалиш. В этой роли выступил председатель Рады Иркутского товарщества белорусской культуры Олег Рудаков. "Далеко от Родины занесла вас судьба. Не забыли ли вы традиции предков ваших?" - вопрошал Купалиш. И вокруг гигантского костра, увенчанного огромным венком (кола), начался праздник. Скажу честно - в таком большом хороводе я не плясала никогда. Под песни ансамбля "Ленушка" мы играли в "Селезень утку догонял", в "Подушечку", в "Бочку". Почему-то все любимые хороводные игры иркутских белорусов оказались играми с поцелуями. Самым же "адреналиновым" развлечением стали "скоки праз вогнішча" - прыжки через костер. По языческим преданиям, перепрыгнувший костер на год избавляется от болезней. Ощущения словами не передать. После полуночи, в волшебное время, когда раз в году цветет "папараць-кветка", все отправились на поиски цветка папоротника. По белорусским обычаям, искать его нужно непременно парами - парень с девушкой; нашедшие цветок становятся неразлучны. И - хотя и искусственный, зато с горящей свечой - цветок одна пара нашла. За что и получила в подарок белорусские рушнички (полотенца).

Дискотека под современную белорусскую музыку шла всю купальскую ночь, перемежаясь чудесами. "Нечистики" украли нашу Купалинку - и с факелами мы отправились на ее поиски. Нашли. На костре варили лечебный звар из 30 белорусских трав - каждый его отведал. Встречали и провожали русалочек, купались в Ангаре (в эту ночь ее вода стала заживляющей), на рассвете гадали на венках. По белорусским обычаям, девушки, бросая свои венки в воду, смотрят, выйдут ли они замуж этой осенью: у тех, кого ждет замужество, венок прибивает к противоположному берегу. Ангару с тихими и узкими белорусскими реками не сравнить, потому и суть гадания была "адаптирована" к природным реалиям. Гадали на желания. Унесет венок течением - значит, сбудется.

Не спугнул празднующих даже дождик - до рассвета народ выплясывал на мокрой танцплощадке. Праздник был замечательным и омрачился лишь дважды. Первый раз - для всех. Один из примкнувших к празднованию "напраздновался" так, что упал с обрыва и сломал руку. Время, пока его искали на темном берегу Ангары, переносили, шинировали-перевязывали (благо у предусмотрительных организаторов был ответственный за медицинскую помощь врач) и ждали "Скорую", показалось всем очень долгим. После отъезда "Скорой" и друзей упавшего организаторам пришлось поднапрячься, чтобы вернуть гостям потерянное настроение и продолжить ритуалы купальской ночи.

Второй раз праздник омрачился лично для меня - собственной невнимательностью после чудесной, но бессонной ночи. Прибыв в Иркутск в 7.00, я со всех ног помчалась на электричку. В 8.20 уже была в Ангарске. Вскочила в маршрутку -"восьмерку" - и домой, отсыпаться. Выспавшись, решила сдать в проявку фотопленку с уникальными кадрами хороводов над Ангарой, Купалинки с князем Купалишем, русалок, уходящих в развевающихся на ветру голубых одеяниях, белорусских веночков, плывущих по великой сибирской реке. Увы - спросонья я оставила кофр (жесткую фотосумку) со своим надежным "ФЭД-50" и вспышкой "UNOMAT" то ли в маршрутке, то ли в электричке. Обзвон диспетчеров маршрутных такси и дежурного по вокзалу пока ничего не дал.

Люди добрые, помогите сохранить память о волшебном празднике - если вы нашли все это, позвоните в редакцию. Родина (и моя, и ваша) вас не забудет, а мы вознаградим.

Анна КАПРАВЧУК.

Пейдж. в Иркутске 56-46-46 аб. АННА,
телефон редакции в Ангарске 9-80-87.

От Редакции «Маланкі»: Да, действительно, очень жаль, что у тебя Ганна потерялся фотоаппарат. Честно говоря, мы рассчитывали именно на твои фотографии. Ведь тем, кто был задействован в активе проведения Обряда, некогда было фотографировать. Да к тому же ты у нас профессионал этого дела. Но больше всего очень жаль твой фотоаппарат. Но не будем отчаиваться. Вдруг произойдёт чудо – отголосок Купальской чудесной ночи – и фотоаппарат найдётся??!

Тогда фотографии за тобой!

Цытата нумара

«Сему Купалу, яшчэ і донынь ... памяць ушаноўваюць, начэнше іюня 23 дня... звечара збіраюцца прастая чадь, обоего полу, і соплетаюць сабе вянцы з зелля, або карэння, і, апераза́ўшыся былём, раскладваюць агонь... і, узяўшыся за рукі, ходзяць вакол гэтага агню, спяваюць свае песні... потым цераз гэты агонь перараскокваюць».

«Густынскі летапіс» Древней Русі.

Весткі з суполак

Купальле ў Нью Ёрку

Да прыезду ў ЗША я думала, што, сустрэўшы трох беларусаў, і ў пустыні здолею ўтварыць Купальле. Першая мая спроба наладзіць Купальле ў ЗША была ў 2000-м годзе ў Белер-Менску. Другая сёлета ў рэзэрвацыі Ўард Понд Рыдж у акрузе Вэстчэстэр. Мясьціна там прыгожая, блізкая сваёю чысьцінёй і веліччу да беларускіх краявідаў. Абапал палянаў з травою па пояс купкамі стаяць вялізарныя разлапістыя дрэвы. Цішыня, якую парушае толькі сьпеў птушак. Але вось кветак там зусім няма і, ведаючы гэта, давялося задаволіцца штучнымі й сьплятаць вянкі зь іх, што надало сьвяткаваньню ад самага пачатку нейкую ненатуральнасьць. Людзі зьехаліся з розных мясьцінаў, два хлапцы з Філядэльфіі, нехта з штатаў Масачусетс, Нью Джэрзі, сябры аддзелу БАЗА у Нью Ёрку.

Як сьцямнела, расклалі вогнішча на пагорку ля старога драўлянага зрубу, у цэнтры якога,замацавалі на слупе кола, зробленае з галінак, з крыжом упрыгожаныя бел-чырвонымі стужкамі. Вакол вогнішча сабраліся гульцы, абралі Купаліша і Купалку. Зрабіўшы тры абыходы зь песьнямі вакол агню, дзяўчаты падвялі Купалку да Князя, той павіншаваў усіх са сьвятам. Пачалі сьпяваць і ваддзіць карагоды. Мне давялося запяваць, каб астатнія, прыслухоўваючыся, падхоплівалі радок сьпеваў паўторам. Удзел бралі ўсе, вельмі стараліся. Потым карагоды зьмяніліся гульнямі.

Апоўначы, калі прыпыніліся гульні й трэба было ісьці шукаць папараць – кветку, усе раптам кінуліся па свае харчы. Відаць, прагаладаліся. Зважаючы на гэта, вырашалі зрабіць агульнае застольле. Тым часам закіпеў духмяны крупнік, якім ўсе пачаставаліся. А пасля нехта пайшоў уладкоўвацца спаць, а сёй-той, як умеў, падцягваў сьпевам ля вагню.

Паціху пачало сьвятаць. Сьветлячкі нібы растварыліся ў паветры. Ніхто так ні разу і ня скокнуў праз вогнішча, ніхто не пайшоў да рэчкі, што ціха цякла непадалёку. Па-шчырасьці, у нас атрымалася сяброўская пасядзелка на прыродзе, як бы рэпэтыцыя Купальля, якую нават не давялі да завяршэньня.

Адная дзеўчына запытала мяне, як я стаўлюся да року. Яна, відаць добра арыентуецца ў гэтым жанры, а вось з сваёй нацыянальнай традыцыйнай культурай амаль незнаёмая. Дый адкуль гэтым маладым людзям ведаць, што фальклёр самадастковы, і ў ім можна жыць, што і прафэсыйная клясычная ды эстрадная музыка бярэ свае вытокі з фальклёру.

Добра, што моладзь прыйшла на Купальле. Шкада толькі, што ня маючы глыбокай нацыянай сьведамасьці, выхаваньня, яна, здаецца, так і не зразумела тую высокую духоўную напоўненасьць сакральных дзеяньняў Купальля.

Але можа ўсё-ж у некага з прысутных на сьвяце маладых людзей запала зерне цікавасьці да нашай народнай культуры й некалі яно прарасьце буйным коласам. Валянціна Якімовіч. Газета «БЕЛАРУС».

<u>Ад рэдакцыі «Маланка»:</u> Шаноўная спадарыня Валя, калісьці я прыходзіў да Вас, калі Вы яшчэ жылі ў Менску. Памятаеце? Тады я рабіў першыя крокі па распаўсюджваньню ў Іркуцкай вобласці беларускіх традыцыйных Абрадаў. Я дакладна ня ведаў, што мне ўдасца зрабіць. Аднак была вельмі моцная Вера ў тое, што традыцыі нашых продкаў трэба выконваць усім беларусам, нягледзячы дзе б яны не жылі. У тую сустрэчу я шмат узяў і ад Вас спадарыня Валя. А зараз выйшла ў Іркуцку мая кніжка «Беларускія абрадавыя сьвяты», дзе сабраны матэрыял пра асноўныя беларускія Абрады, прычым даецца як гісторыя іх, так і сцэнары сыходзячы з нашага сямігадовага практычнага вопыту. Дык вось, зараз у Прыбайкальлі ладзяць Купальле і іншыя Абрады так, як гэта рабілі нашы продкі тысячу й болей год назад. Хоць яшчэ і ёсць не зусім дасвечаныя людзі, асабліва сярод журналістаў якія распавядаюць пра дзеі, дый скажаюць іншым разам іх сутнасць, аднак сябры нашай суполкі ўжо разумеюць й сэнс, й асноўныя абавязковыя атрыбуты нашых Сьвят.

Спадзяюся, што і ў Нью-Йорку пад Вашым кіраўніцтвам паступова складзецца актыў, які й будзе ладзіць годнае Купальле ў Амерыцы. З прыветаньнем да Вас Алег Рудакоў.

Нам пішуць

Паважаны Алег Васільевіч!

Прапануем творчае супрацоўніцтва з харавым ансамблем «Арыента» Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Маскоўскага раёна г. Мінска. У хоры спяваюць 12 дзяўчын ва ўзросце 16-19 год. Накірункі дзейнасці калектыву наступныя: адраджэнне беларускай песеннай культуры, выканне твораў беларускіх сучасных аўтараў. У апошні час калектывам быў рэалізаваны праект «Песні маёй Радзімы», які заснаваны на спадчыне славутага беларускага хормайстра Рыгора Шырмы. Праект ажыццяўляўся пры садзейнічанні Міжнароднай Асацыяцыі беларусістаў, кіраўніком якой з'яўляецца прафесар Адам Мальдзіс. У межах праекту створаны канцэртныя праграмы ў дзвюх частках: «Калянарнае кола» і «Песні кахання». Першая з іх была прадстаўлена ў 1999 – 2001 г.г. у розных краінах Еўропы, атрымала дыплом Міжнароднага конкурса сучаснай харовой музыкі ў Венгрыі (г. Дзебрэцэн). У 2002 годзе ўбачыла свет наступная частка праекту – «Песні кахання». З гэтай праграмай калектыў выязджаў у Польшу і Літву, дзе ладзіў канцэрты для беларускай этнічнай суполкі. Адзнака мастацкага ўзроўню выступленняў была вельмі высокай.

Калектыў шукае рэальных кантактаў з прадстаўнікамі беларускіх супольнасцей за мяжой пашырэння геаграфіі канцэртаў. Калі гэтая інфармацыя зацікавіць Вас, мы маглі бы даслаць дэманстрацыйны запіс, а таксама рэцэнзіі на выступленні калектыву і рэкамендацыі беларускіх арганізацый, з якімі харавы ансамбль супрацоўнічаў на працягу апошняга часу. З найлепшымі пажаданнямі – Алена Гуляева, кіраўнік харавога ансамблю «Арыента»

<u>Ад рэдакцыі «Маланка»:</u> Вялікі дзякуй за ліст. Спадзяёмся, што Вы здолееце прыехаць да нас у Іркуцк.

Падзеі і справы ІТБК

Праздник Купалья в Черемховском отделении ИТБК.

Белорусские чудеса – волшебство огня, воды и трав.

Земля ингинская познала радость необыкновенного праздника. В ночь с пятого на шестое июля белорусы со всего Черемховского района провели там красивейший обряд. Как гласит легенда, в ночь на Ивана Купалу совершаются чудеса – раскрывается цветок папоротника, волшебной разрыв-травы. Кто его найдет, тому откроется тайна спрятанных в земле сокровищ и кладов. А если то окажется молодая пара, то, пройдя очищение огнем, быть ее в любви вечной и незыблемой.

А еще в эту ночь все собранные травы и коренья имеют чудодейственную силу. Испив приготовленный на священном костре напиток из этих трав, человек исцеляется от недугов, становится сильным и непобедимым. Вода же, познавшая поцелуй первых лучей солнца, обращается в святую и силой своей великой очищает всяк входящего в нее от бед и напастей, лечит от болезней тягостных.

Место проведения организаторы выбрали великолепное. На въезде в таежную деревушку Инга, привольно раскинулась поляна подле озера. Там-то и происходило все действо. Съезжающихся на праздник, встречали разноцветные флаги, огромный, нацеленный в небо костер (вогнище), ожидающий своего часа возгорания и, конечно, хозяева.

Разместившись, наскоро перекусив, гости собираются в центр деревни - клуб. Именно оттуда начинается первая часть - шествие с песнями, музыкой к месту купального обряда. Пропустить необыкновенное чудо никто из ингинцев не пожелал. От мала до велика они, неизбалованные подобными зрелищами, высыпали на тихую, до того часа, улочку. И смешавшись с гостями, составили пеструю ленту шествия. Гостей же прибыло множество. Художественные коллективы из Черемхово, Михайловки, Новостройки, представители районной и городской власти и вообще, все, кто пожелал объединиться душой с белорусским народом. Не говоря уже о самих белорусах и тех, в ком течет хоть капелька крови великого народа. По сценарию, вечер пред купальной ночью заполнен конкурсами, играми, песнями. Что и произошло. Вокальные группы, солисты пели песни на белорусском, русском языках, исполняли задорные частушки с переплясом. Покорили слушателей женщины из вокальной группы Инги. Более 20 лет существует эта группа, причем, практически на голом энтузиазме каждой вокалистки и их руководителя Любови Герасимовой. От них прозвучали белорусские песни, песни о себе и своей деревне, задорная "Бабка Любка". Причем, именно в этом коллективе оказалась самая юная участница праздника, пятилетняя Люба Герасимова. И это ей из рук мэра Александра Скворцова была вручена огромная кукла-приз, как самой маленькой певунье.

"Варенички", "Речка-реченька" - лилось из уст новостроевской "Рябинушки". Волнение женщин испаряется под горячими аплодисментами зрителей. А запевала Анатолий Зоркальцев покорил всех напрочь. Яркими жарками расцветают на поляне "Ветераночки" из Михайловки. Изумруд травы только подчеркивает слепящие расцветки костюмов. Среди солистов одна из старейших (так же отмеченная особым призом из рук мэра) участниц - Анна Биркина. В свои 75 лет она полна энергии и энтузиазма. А голос... его надо слышать. Черемховский "Родник" - это звезды, известные далеко за пределами города и района. Их нет нужды представлять. Одна изюминка - солист Михаил Шкаленов родился в Инге. Наверное, поэтому особенно задушевно звучал его голос на вольном воздухе малой Родины. Потрясающие голоса Людмилы Касьяновой, Валентины Пашковой, Николая Бекешева наверняка заставили притихнуть даже хозяев тайги, медведей, да лосей, если, конечно, таковые еще водятся окрест...

...Двухчасовой концерт не оставил равнодушным никого. И помехи в аппаратуре не стали препятствием самым голосистым. Хотя жюри и привел этот прискорбный факт в некоторое замешательство. Посовещавшись, члены жюри пришли к выводу, что устраивать подведение итогов с определением мест не имеет смысла - все были хороши по-своему. Поэтому наградили каждого, кто решился выйти на сцену. Надо отметить, что не только пели. Людмила Артемова, поэтесса из Михайловки привезла на праздник специально написанные по этому случаю свои стихи. "Мы любим вас!" - кричали ей из толпы зрителей...

А далее был купальский обряд... И запутался в соснах от удивления ветер, и стремились вниз изумленные звезды, и серебристо мерцала в полете зачарованная рыба - все вокруг пропиталось таинством колдовского действа. Князь Купалиш (Василий Ракито) благополучно встретил нежную Купалинку (Ирина Мелентьева) и они вместе зажгли костер. Искры яростно взметнулись над пламенем, перемешиваясь со сверкающими звездами, огоньками свечей в поднятых людских ладонях, и отражаясь в росе венков, украшавших на головах свиту Купалинки... Тем венкам под утро плыть по реке... На поиски папоротника бросились жаждущие вечной любви пары... Счастливые Денис и Алена, завладевшие волшебным символом, будут отныне неразлучны всю жизнь - и они стали первыми, кто получил право на прыжок через костер. А значит, очистились от сглаза, нечистой силы. Впрочем, эта же награда ожидала их последователей.

С первыми лучами солнца окунались в воду и, завершая обряд, князь Купалиш запустил по воде венок со свечой. А вслед за ним и все желающие погадать на суженого... Нет, невозможно описать все словами. Не хватает прилагательных и места. Одно скажу - такому празднику быть необходимо. Единение людей - вот высшая награда от него. И не было бы этой ночи, если бы не упорство Василия Станиславовича Ракито – главного виновника чудес. Чего ему стоило, знает только он сам. А еще невозможно было бы насладиться праздником в полной мере без гостеприимства хозяев. Татьяна Фирюлина, Наталья Можарова, Людмила Фролова - это местные женщины, которые так радушно встретили гостей и предоставили им все необходимое, что слов благодарности мало - низкий им поклон, до земли. Усилия заведующей ингинским клубом Любови Герасимовой не прошли даром, как и усилия директора ДК им. Горького Сталины Логиновой (ведущей праздника). И как приятно им было слышать дружное из уст молодежи, танцевавшей без устали до утра, "приезжайте еще... пожалуйста...". Это было впервые. Но вопреки всему "блина комом" не получилось. Энергетика огромной массы счастливых людей сделала свое благое дело... А значит – продолжать следует. И как выразился Василий Станиславович - "постараемся стать еще ближе к природе...".

Ярослава Ярина

P.S. Уже после праздника поступил звонок от Олега Рудакова – Председателя Рады ИТБК им. Яна Черского. Он поздравлял и сожалел, что не мог присутствовать лично и просил передать всем: "Я мысленно праздновал с вами...".

ВЕСТКІ З БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

В Беларуси начинается новая антироссийская кампания?

Недавнее интервью президента Беларуси трем отечественным телеканалам номинально было посвящено Дню независимости. Но наряду с дежурными фразами о трудном пути становления суверенитета в нашей стране, устами президента были озвучены и обновленные взгляды государства на отношения с внешним миров, в первую очередь, с Россией. Этой теме была посвящена очередная передача <u>*Радыё Свабода*</u> из серии "Экспэртыза Свабоды". Для участия в передаче ее ведущий Валерий Карбалевич пригласил главного редактора интернет-газеты "Белорусские новости" Александра Класковского и политолога Владимира Подгола.

Валер Карбалевіч: Упершыню напярэдадні Дня Рэспублікі Лукашэнка даваў інтэрвію, якое было паказанае адразу на трох беларускіх тэлеканалах. Факт даволі незвычайны. У тэзах, выкладзеных ім, былі даволі цікавыя акцэнты. Паколькі інтэрвію было прысьвечанае Дню незалежнасьці, то тэма незалежнасьці стала лейтматывам усёй гутаркі. Якое агульнае ўражаньне ў вас ад гэтага інтэрвію? Які сэнс у гэтай PR-акцыі?

Аляксандар Класкоўскі: Я зьвярнуў увагу, што выглядаў беларускі лідэр незвычайна стрымана. Ён гаварыў амаль што без эмоцыяў. А гэта сьведчыць аб тым, што ўсе выкладзеныя ім тэзы, заявы і высновы рабіліся вельмі прадумана. Калі летась у канцы году падчас "газавага скандалу" рэзкія заявы Лукашэнкі можна было растлумачыць нейкімі форс-мажорнымі варункамі, то цяпер усё гэта прадуманая PR-акцыя. Галоўны тэзыс быў такі. Упершыню так закончана, з усіх бакоў абмаляваны вобраз ворага ў абліччы Расеі. Прычым, з інтэрвію вынікала, што не асобныя нейкія злыя сілы, "праціўнікі інтэграцыі", як казалася раней, а ўсе расейскія эліты ў розных кантэкстах праводзяць антыбеларускую палітыку. Згадваліся і алігархі, і кіраўніцтва Расеі, і расейскія мэдыі. Наконт апошніх было сказана, што яны вядуць супраць Беларусі інфармацыйную вайну. А нашыя наіўныя грамадзяне, мусіць, думалі, што ўсё яшчэ грымяць барабаны інтэграцыі.

Галоўнае пытаньне: дзеля чаго гэта робіцца? Я думаю беларускі кіраўнік прадбачыць хуткае абвастрэньне стасункаў з Масквою. І галоўнаю праблемаю будзе пытаньне аб падаўжэньні яго прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў. А Расея адносіцца да гэтага нэгатыўна. Таму загадзя рыхтуецца глеба, сьвядомасьць электарату да публічнай рэакцыі Масквы.

І яшчэ Лукашэнка пазыцыянуе сябе гарантам беларускага сувэрэнітэту. І тым самым ён выбівае глебу ў апазыцыі. Такім чынам, гэтая акцыя мае адразу некалькі задачаў.

Уладзімер Падгол: Лукашэнка патрапіў у абцугі. З аднаго боку, умацаваўся вобраз Пуціна. Падчас сьвяткаваньня 300-годзьдзя Санкт-Пяцербургу Пуцін пазыцыянаваўся нашчадкам расейскіх цароў. А ў Калінінградзе расейскага прэзыдэнта прадстаўлялі як спадкаемца савецкай імпэрыі. І гэты магутны вобраз Пуціна падцісну ў Лукашэнку.

Трэба зьвярнуць увагу на тое, што Пуцін дыстанцыяваўся ад Лукашэнкі. Калі яму задалі пытаньне аб трэцім тэрміне беларускага прэзыдэнта, ён сказаў, што я ня ведаю, што там творыцца, а я на трэці тэрмін не пайду.

А другі бок абцугоў — Дзень незалежнасьці. Ёсьць і трэці бок ціску на Лукашэнку. Гэта ўсе абставіны, зьвязаныя зь сьмерцю і пахаваньнем Васіля Быкава. Нечакана на палітычнай арэне паміж Пуціным і Лукашэнкам, якія ўжо пэўны час вядуць завочнае спаборніцтва паміж сабою, усунуўся Быкаў. Пуцін выказаў вельмі цёплае спачуваньне з нагоды ягонай сьмерці. Расейскія СМІ прадэманстравалі павагу да Быкава, а на кантрасьце паказалі дрэннае стаўленьне да вялікага пісьменьніка з боку беларускай улады. І плюс да гэтага — усенароднае ўшанаваньне памяці Быкава ў Менску.

І такім чынам, рэйтынг Лукашэнкі апынуўся пад пагрозаю. І ён гэта адчуў. І ў сваім інтэрвію ён мусіў, з аднаго боку. спабрнічаць з Пуціным, а зь іншага боку, спаборнічаць з Быкавым у адстойваньні незалежнасьці Беларусі. То бок, Лукашэнка адчуў, што псыхалягічна яго загналі ў кут. І ён зрабіў першую спробу вырвацца з гэтага кута.

Карбалевіч: У мяне склалася ўражаньне, што Лукашэнка гаварыў цяжка, ня вельмі гладка, часам ня вельмі зразумела для людзей, далёкіх ад палітыкі. Здавалася, што ён дрэнна падрыхтаваўся, разьлічваючы на сваю здольнасьць да імправізацыі. Я, напрыклад, ня ўбачыў нейкага імпэту, энтузіазму, натхненьня.

Некаторыя тэзысы былі дзіўнымі. Напрыклад, калі ён тлумачыў, што такое незалежнасьць. На ягоную думку, незалежнасьць — гэта калі людзі могуць павесьці дзяцей у парк, у лес ці мець кавалак зямлі для апрацоўкі. Узьнікае пытаньне, ці разумее чалавек сам, што такое незалежнасьць?

Адной з галоўных ідэяў гутаркі было тое, што з усіх бакоў, і з Захаду, і з Усходу ад Беларусі знаходзяцца нядобразычліўцы, якія ціснуць на краіну, імкнуцца "пакласьці, разьдзяліць і падпарадкаваць". Але найбольш цікава тое, што галоўная пагроза дзяржаве — не з Захаду, як звычайна тлумачылася. Захад быў узгаданы коратка і ўскосна. Высьветлілася, што галоўная пагроза Беларусі існуе з боку найбліжэйшага саюзьніка і сябра — з боку Расеі, аб чым ужо казаў спадар Класкоўскі. Менавіта Масква хоча далучыць да сябе, захапіць нашыя прадпрыемствы, распачынае інфармацыйную вайну і іншае. Як бы вы пракамэнтавалі гэтыя тэзы?

Класкоўскі: Я лічу, што тут беларускі афіцыйны лідэр і ня крывіць душой, калі кажа пра гэтую пагрозу з боку Расеі. Іншая справа, што тут трэба адсунуць убок высокую рыторыку пра незалежнасьць, патрыятызм. Справа ў тым, што існуе пагроза палітычным плянам кіраўніка Беларусі, найперш плянам падаўжэньня яго прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў. Вось у гэтым галоўная прычына яго антырасейскіх выпадаў.

Крэмль ня хоча прымаць Канстытуцыйны акт, які даў бы легальную падставу для супольнага з Расеяй рэфэрэндуму. Таму Лукашэнку давядзецца ладзіць плебісцыт аўтаномна. А для гэтага патрэбнае нейкае ідэалягічнае абгрунтаваньне. І таму антырасейская рыторыка Лукашэнкі — прэвэнтыўнае абгрунтаваньне тых дзеяньняў, якія зьбіраецца рабіць беларуская ўлада. І магчымая крытыка з боку Масквы будзе трактавацца як варожыя наскокі, патаемнае жаданьне падмяць і падзяліць Беларусь.

Падгол: Антырасейскую кампанію можна патлумачыць вельмі коратка: страх за сваю ўладу. Любое рэальнае збліжэньне з Расеяй — ці ў галіне палітыкі, ці эканомікі — гэта пагроза сваволі Лукашэнкі ў Беларусі. Таму будуецца вялікая беларуская сьцяна паміж Расеяй і Беларусьсю. Пагроза ўладзе Лукашэнкі цяпер больш зыходзіць з Масквы, чым з Захаду.

(Працяг на бач. 6.)

В Беларуси начинается новая антироссийская кампания?

(Парцяг. Пачатак на бач.5)

Карбалевіч: Калі б у гэтым інтэрвію ўдзельнічаў незалежны журналіст, то ён мог бы задаць натуральнае пытаньне. Мудры кіраўнік дзяржавы мог бы даўно ўбачыць гэтую небясьпеку з боку вялікага суседа і паспрабаваць максымальна дыстанцыявацца ад такой небясьпекі. А Беларусь наадварот — апошнія гады трапляла ва ўсё большую залежнасьць ад Расеі. Дык хто ж гэты Іван Сусанін, які дзевяць гадоў вёў беларусаў не туды, вёў у гэтую пастку? І ці зможа чалавек, які завёў у багну, вывесьці зь яе?

Але такое пытаньне не было зададзенае. Наадварот, здаецца, цэнтральная ідэя інтэрвію была ў тым, што менавіта Лукашэнка зьяўляецца галоўным і адзіным абаронцам і гарантам беларускай неалежнасьці, аб чым ужо казалі мае суразмоўцы. Менавіта ён супраціўляецца ўсім памкненьнм, і з Захаду, і з Усходу, захапіць Беларусь. Таму пакуль ва ўладзе Лукашэнка, краіне нічога не пагражае. Ці згодныя вы, з тым, што менавіта такое ўражаньне хацелі зрабіць ініцыятары гэтай PR-акцыі? І ці ўдалося гэта?

Класкоўскі: Натуральна, што любы апазыцыянэр скажа словамі Станіслаўскага: "Ня веру!" І скажа, што ўсё гэта няшчыра, фальшыва, згадае, што за кулісамі ідзе палітычны гандаль і іншае. Але Лукашэнка працуе на электарат. Вось вы, спадар Карбалевіч, адзначылі, што праблему незалежнасьці кіраўнік дзяржавы трактаваў неяк прымітыўна: магчымасьць пайсьці ў лес, у парк і іншае. Я думаю, гэта невыпадкова. Гэта гульня на рэліктавых асаблівасьцях масавай сьвядомасьці. І рыторыка ў абарону незалежнасьці ідзе ў зьвязку з такімі тэзамі: калі страцім незалежнасьць, то прыйдуць алігархі і будзе шокавая тэрапія, будзе беспрацоўе, забяруць зямлю, будзе кепска. "А я вас ад гэтага ўсяго абараню", — кажа Лукашэнка. Інакш кажучы, ідзе эксплюатацыя патэрналісцкіх ілюзіяў.

І гэта своеасаблівы выклік апазыцыі. Бо цяпер у яе адбіраюць незалежніцкую палітычную прастору. Яе прымушаюць у піку Лукашэнку стаць прыхільнікамі "шокавай тэрапіі", "абвальнай прыватызацыі". А гэта вельмі нявыйгрышнае пазыцыянаваньне.

Калі ж узьняцца над гэтай палітычнай схваткай, над кан'юнктурнымі палітычнымі хадамі, то можна адзначыць, што незалежна ад суб'ектыўных памкненьняў таго ці іншага боку, ва ўсім гэтым ёсьць і нешта станоўчае. Галоўнае, што варункі аб'ектыўна працуюць на ўмацаваньне незалежнасьці. Можна спрачацца наконт таго, наколькі шчыра паводзіць сябе кіраўнік Беларусі. Але беларуская ўлада мусіць рабіць захады дзеля абароны незалежнасьці. І немагчыма ўявіць, што заўтра Лукашэнка скажа: "Я перадумаў, хочіць зь мяне пасады расейскага губэрнатара". Надта шмат ужо было сказана ў абарону незалежнасьці. Ёсьць нейкія незваротныя рэчы, і час працуе на незалежнасьць.

Карбалевіч: Тут узьнікае пытаньне. Чалавек які восем гадоў толькі і цьвердзіў аб інтэграцыі з Расеяй, цяпер выступае ў супрацьлеглай ролі. Ці можа паверыць у гэта насельніцтва? Як прарэагуе глядач, калі адзін і той жа актор на працягу аднаго спэктаклю пачынае гуляць другую ролю?

Падгол: З гледзішча абаронцы незалежнасьці ад Расеі выступ быў вельмі няўдалы. Тыя словы, якія казаў Лукашэнка, былі правільныя. Я згодны са спадаром Класкоўскім, што ўзгадваньне пра кавалак зямлі — гэта зусім не прымітыўны ход. Для беларуса кавалак зямлі — гэта сэнс жыцьця.

Але няўдалая форма, у якой Лукашэнка спрабаваў гэта рабіць... Сапраўды, гэта крызыс жанру. Магчыма, уся справа ў тым, што яму проста недаспадобы пра незалежнасьць казаць. Таму мы бачылі павольнасьць, адсутнасьць эмоцыяў. І цалкам адсутнічала абуджэньне якога-небудзь архетыпу. Працягваючы вашую думку, спадар Класкоўскі, я лічу, што электарат таксама казаў сам сабе: "Ня веру!"

Карбалевіч: Такім чынам, з гэтага, здавалася б руціннага інтэрвію з нагоды дзяржаўнага сьвята можна зрабіць дзьве галоўныя высновы. Па-першае, у краіне пачынаецца новая антырасейская кампанія, якая часам ужо дасягае ўзроўню аналягічнай кампаніі восені мінулага году. Па-другое, Лукашэнка хоча пазыцыянаваць сябе галоўным абаронцам беларускай незалежнасьці. Іншае пытаньне, ці ўдасца перакананаць у гэтым насельніцтва?

«Радыё Свабода»

Назад у СССР

Менгарвыканкам прыняў унікальнае рашэньне: аб перайменаваньні станцыі метро «Ракаўская» ў «Спартыўную». Канфлікт разгарэўся ў канцы красавіка, калі ў гасьцявой кнізе на сайце Менгарвыканкама нейкі чалавек, які падпісваецца «Міхаіл Майсеевіч, Галландыя», выказаў сваё «фэ» назве «Ракаўская». Маўляў, у яго з гэтым словам дрэнныя асацыяцыі – ракавыя пухліны, на якія так хварэе зьнявечаная Чарнобылем беларуская зямелька. Намеснік мэра сталіцы Мікалай Ярохаў адрэагаваў імгненна, ён адказаў Міхаілу Майсеевічу, што адпаведныя захады ўжо прынятыя – «Ракаўская» будзе перайменаваная ў «Спартыўную». Пасля гэтага ў недзяржаўнай прэсе і на сайце Менгарвыканкама разгарнулася гарачая дыскусія, большасьць удзельнікаў якой жостка крытыкавалі пазыцыю сталічнай мэрыі. Аднак на пасаджэньні гарвыканкамі была пастаўленая кропка: назва «Спартыўная» прынята з улікам таго, што побач са станцыяй знаходзіцца будынак, які прадстаўляе вялікую гістарычную каштоўнасьць, - Лядовы хакейны палац, ну і адпаведна ў мэтах «папулярызацыі здаровага ладу жыцьця». Мэр Паўлаў паставіў канчатковую кропку, заявіўшы, што назва «Спартыўная» яму падабаецца – «сучасная».

Дадамо, што кіраўніцтва менскага мэтрапалітэну прыняло рашэньне станцыі «Плошча Незалежнасьці» надаць ранейшую назву – «Плошча Леніна». Маўляў, жыхары сталіцы блытаюцца: абвяшчаюць у цягніку «Плошча Незалежнасьці», а шыльдачкі сьведчаць, што прыехалі на станцыю «Плошча Леніна». Бедныя, ня ведаюць куды ісьці. Застаецца толькі вярнуць Плошчы Незалежнасьці яе савецкую назву.

«БЕЛАРУС» № 486

Польшча

Паводле Ўсеагульнага перапісу жыхароў Польшчы 2002 году сярод непольскіх народнасцей, якія найчасцей былі названы ў адказах, на першым месцы знаходзіцца нямецкая – 152,9 тыс. асоб, а наступная, паводле афіцыйных дадзеных, беларуская – 48,7 тыс. Украінцаў у Польшчы – 31,0 тыс. асоб, рускіх – 6,1 тыс., літоўцаў – 5,8 тыс.

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ **"БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ"**

ВЕСТКІ З БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Беларусы зьнялі гістарычны фільм

Анастасія для мяне – роля вельмі хвалюючая і адказная.

Вобраз Анастасіі Слуцкай, як адзначылі кінакрытыкі пасля прэм'ернага паказу, - гэта першы вялікі посьпех ў кіно для маладой актрысы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Святланы Зеляноўскай. Але, відаць, фартуна ўсміхнулася дэбютанцы – абаяльнай і прыгожай – невыпадкова. Па словах самой Слуцкай «княгіні», дарога да экраннага поспеху была і хвалюючай, і адказнай.

«Я з павагай адношуся да сваёй Радзімы, краіны і культуры, - адзначыла Святлана пасля першага прагляду кінастужкі, які адбыўся ў прысутнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, – і таму, спадзяюся, здолела годна данесці да гледача вобраз Анастасіі, - з усёй сваёй любоўю і ўсёй сваёй шчырасцю. Для мяне было самым галоўным каб я ўклала ў яе сваю душу…»

Запатрабаваны ў нацыянальным кінапрекце былі і патрыятызм, і прафесійнае стаўленне да працы. Актрыса па сюжэту гістарычнай драмы як жонка слуцкага князя Сямёна Аляльковіча была і любячай пяшчотнай жанчынай, і абаронцай роднага Слуцка. Нездарма менавіта яна ўвайшла ў народны фальклор як беларуская Жанна д'Арк. Па стужцы ёй належыць шчаслівы і цяжкі жаночы лёс, а таксама адчайныя крокі і кульмінацыя славы. Напярэдадні апошняй і самай цяжкай бітвы Анастасія так звярнулася да случчан: «Мы пераможам! Абараняць свой народ – святая справа, за яе і памерці не страшна!»

Гераічнасцю і драматызмам прасякнуты кожная хвіліна кінадрамы. Пачынаючы з першых імгненняў, глядач нібы пераўвасабляецца ў равесніка тагу часу… Пачатак 16-га стагодзя. Багатыя землі ў цэнтры Еўропы, на скрыжаванні гандлёвых шляхоў, былі жаданай здабычай для суседзяў. 20-тысячная армія татар нападае на Слуцк з поўдня. Хан Баты-Гірэй намерваецца ўзяць штурмам горад несумняваючыся ў перамозе над праваслаўнымі гараджанамі, якімі пасля смерці мужа кіруе маладая княгіня. Анастасія здолее перамагчы і ўратаваць сябе і родны Слуцк, тым самым яшчэ раз заваюе права на любоў і памяць нашчадкаў…

Дынамічны сюжэт, аптымістычны фінал, цудоўная гульня беларускіх і расійскіх акцёраў, майстэрства рэжысёра-пастаноўшчыка і аператара, багацце касцюмаў і музычнага афармлення – усё гэта мастацкі фільм-легенда «Анастасія Слуцкая», аповесць пра каханне і здраду, любоў да роднай зямлі і вялікую будучыню Беларусі.

«Народная газета» Эла Чазава.

СВЯТКАВАННЕ 10-ГОДДЗЯ ПЕРШАГА З'ЕЗДУ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ

6 ліпеня адбыліся святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 10-м угодкам Першага з'езду беларусаў свету. Віншаванні з юбілеем прыходзілі ў адрас МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" ўжо задоўга да гэтага ўрачыстага дня.

Святочныя мерапрыемствы пачаліся а 14-й гадзіне. На вуліцы Койданаўскай (цяпер Рэвалюцыйная) у фае дома № 15 – будынку, дзе ў 1921 г. быў заснаваны Інстытут беларускай культуры, – адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі, прысвечанай заснавальнікам гэтай навучальнай установы. У прысутнасці творчай інтэлігенцыі, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый Беларусі і дыяспары, карэспандэнтаў урачыстасць пачаў акадэмік Радзім Гарэцкі, пасля выступіў ініцыятар стварэння дошкі прафесар Адам Мальдзіс. Аўтар гэтага манументальнага твора скульптар Алесь Шатэрнік урачыста адкрыў мемарыяльную дошку і прачытаў вельмі пранікнёны верш.

А палове на шостую ў вялікай зале Дома літаратара распачалася ўрачыстасць з удзелам дэлегатаў і гасцей Першага з'езду. Як і на Першым з'ездзе беларусаў свету, гукі сурмы абвясцілі аб пачатку ўрачыстага пасяджэння. У прыўзнятай атмасферы загучаў гімн Згуртавання "Бацькаўшчына" і слынны беларускі гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Перад прысутнымі выступілі акадэмік Радзім Гарэцкі, старшыня Саюзу беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, даследчыца Лідзія Савік, гісторык Леанід Лыч, экс-міністр замежных спраў Пётр Краўчанка, экс-міністр інфармацыі Анатоль Бутэвіч, прадстаўнікі беларускай дыяспары: з Літвы – Хведар Нюнька, з Польшчы – Яўген Вапа, з Расіі – Антон Сабалеўскі.

Падчас урачыстасці працавала вялікая выстава, прысвечаная тром з'ездам беларусаў свету, якія прайшлі за гэты час, а таксама дзейнасці "Бацькаўшчыны" за 10 мінулых гадоў.

А 19-й пачаўся святочны канцэрт. Канцэртная праграма была пабудавана на шэдэўрах беларускай музыкі ад XV да пачатку XX стагоддзяў. Трыо "Вытокі" пазнаёміла публіку з творамі Міхала Казіміра Агінскага, Міхала Клеафаса Агінскага, Міхала Ельскага, чым выклікала шчырае захапленне і авацыі. Далей на сцэне загучалі старадаўнія беларускія мужчынскія спевы ў выкананні фальклорнага гурта "Кудмень". Завяршыў канцэртную праграму гурт сярэднявечнай беларускай музыкі "Стары Ольса" з высакароднымі і рашучымі мелодыямі старадаўніх літвінаў.

Яшчэ доўга не разыходзіліся людзі. У вестыбюле спявалі "Пагоню" і іншыя патрыятычныя песні.

Урачыстасць адбылася дзякуючы сумесным арганізацыйным намаганням "Бацькаўшчыны" і Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Інфармацыйны цэнтр МГА "ЗБС "Бацькаўшчына"

НАВІНЫ З СУПОЛАК

Вашынгтон, ЗША

Лідэры беларускай дыяспары правялі плённыя сустрэчы з амерыканскімі палітыкамі. Закраналіся пытанні аб пагрозе незалежнасці Беларусі, аб гарантыях беларускай незалежнасці, аб Акце аб дэмакратыі ў Беларусі, які будзе пастаўлены на галасаванне ў Кангрэсе. Таксама было пастаўлена пытанне аб дыскрымінацыі беларусаў у сувязі з выдачай іміграцыйных дакументаў. Прайшлі таксама сустрэчы ў Дзяржддэпартаменце ЗША.

"Народная Воля". 2003. 26 чэр.

СЯБРОЎСКІЯ СКЛАДКІ

Рада ИТБК искренне благодарит всех наших друзей за сдачу взносов на деятельность нашего Товарищества. Мы напоминаем, что на 5-ом Съезде нашей организации было решено утвердить **минимальный** взнос с каждого члена ИТБК **100 рублей в год.** Безусловно, это минимум, который мы надеемся **каждый** сможет уплатить.

Кто может больше – ещё лучше.

Взносы можно сдать в нашей Сядзібе по адресу: **ул. Чехова, д.2. тел. 20-11-72.**

Сядзіба работает: ежедневно с 16.00 до 19.00 часов, кроме воскресенья.

Также можно осуществить перечисления на наш расчётный счёт:

Банковские реквизиты: «Востсибтранскомбанк» Р/с 40703810300001037701; ИНН 3808029567; БИК 042520849; К/с 30101810700000000849; «ИТБК им. Я. Д. Черского».

Взносы в июле 2003 года сдали: Яковенко В. К., Рудаков О. В., Кез С. В., Громыка Т. М., Мишин А. В.

Усім сябрам Вялікі Дзякуй за падтрымку нашай супольнасці.

Жыве Беларускі народ! Жыве Беларусь!

Нам пішуць

Добры дзень, шаноўны Алег Васільевіч!

Мы з Вамі асабіста, пакуль што, не знаёмы. Але пачынаючы з таго дня, як нейдзе на пачатку 1997 года ў газеце «Наша слова» зьявіўся артыкул пра дзейнасць вашага Тавырыства, усялякія зьвесткі пра Беларусаў Сібіры мяне вельмі зацікавілі. Прыемна чуць, што сібірскія Беларусы ўва многім захавалі сваю самабытнасць. У той час, як беларуская прысутнасьць ува ўсім сьвеце, асабліва ў РБ, знікае. Жахліва назіраць крывазьмяшэньне беларускіх дзяўчат з прадстаўнікамі афра-азіяцкіх народаў, якое апошнім часам набыло на Беларусі маштабы, якіх ня ведала нават Лацінская Амерыка. Дарэчы, усё гэта адбываецца пры актыўнай падтрымцы праўрадавых колаў. На памяць прыходзіць развагі М. Ткачова і З. Пазьняка, што галоўнай задачай Расеі было ня сколькі заваяваньне нашае тэрыторыі, як фізычнае зьнішчэньне нашага народу.

І вось цяпер, калі здавалася б, усе сродкі вычарпаныя. Калі «нацыянальная інтэлегенцыя» паказала сваю поўную няздольнасьць да якіх-небудзь рашучых дзеяняў, а прадстаўнікі палітычных партыяў – сваю здольнасьць прадаць родную краіну за гранты. Я лічу што неабходна прыняць неардынарныя крокі. У «Нашам Слове» за 28 жніўня 2002 г. зьявіўся артыкул Леаніда Лыча «Ратуйма беларуска – моўную меньшыню!», у якім прафесар прапануе ўсім сапраўдным Беларусам аб'явіць сябе нацыянальнай меншасьцю ў РБ (што фактычна і ёсць) і карыстацца ўсімі правамі, якія маюць прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў ува ўсім сьвеце. Дарэчы, на Беларусі шмат хто падзяляе гэтую думку. Але б мне хацелася б ведаць Вашае меркаваньне, як прадстаўніка нац. меншасьці у РФ. Ці зьвіцца гэтакі крок сапраўднай спробай ўратаваньня нашага народу ад зьнішчэньня?

І яшчэ хачу папрасіць Вас вось аб чым: у Вашым інтэрвью «Нашаму слову» Вы казалі, што сярод Беларусаў Іркуччыны ёсьць баптысты. Мяне гэта асабліва зацікавіла, бо я сам ужо некалькі гадоў зьяўляюся членам Беларускай Эвангельскай Царквы (царква трымаецца кансэрватыўна – баптыскага накірунку; чытаньне слова, сьпевы і малітвы адбываюцца на-беларуску). Таму, калі сярод Іркуцкіх шчырых Беларусаў ёсьць мае аднаверцы, вельмі прашу дапамагчы наладзіць зь імі сувязь. Буду вельмі ўдзячны! Да пабачэньня!

Пятровіч Сяргей Паўлавіч

Ад Рэдакцыі: Вялікі дзякуй за добрае слова Сяргей Паўлаіч. Мы падзяляем тую думку, што на жаль у Беларусі – беларусаў не пашпартных, а сумленных і шчырых, якія карыстаюцца сваёй мовай дый ганарацца гэтым вельмі мала. І, безумоўна такім беларусам трэба аб'ядноўвацца ў адно, каб беларуская Нацыя не зьнікла з мапы Сьвету. А вось наконт вернікаў пакуль нічога не можам патлумачыць. Тое, што сюды ссылалі беларусаў-пратэстантаў – ведаем, аднак ці захавалі яны сваю арганізаваную суполку – такіх звестак у нас пакуль няма. Усяго Вам добрага! Лістуйце.

ПОЛЬШЧА

Сталі вядомыя вынікі польскага перапісу. 50 тыс. чалавек залічылі сябе да беларускай нацыянальнасці. Болей, чым чакалася. Болей, чым украінцаў і літоўцаў у Польшчы разам узятых. Але меней, чым лічылася ў савецкі час. Нямала беларусаў, трэба думаць, знайшлося сярод найбольшай нацменшасці ў Польшчы – 775 тыс. чалавек залічылі сябе да "ніякай нацыянальнасці". Са свечкаю беларусаў не знойдзеш цяпер у каталіцкай і яшчэ 100 гадоў таму суцэльна беларускай Сакольшчыне – асіміляваныя цалкам. Лапік беларускасці ў Польшчы сціснуўся да праваслаўных паветаў. І ўсё ж 50 тыс. свядомых беларусаў – гэта сіла. Заціснутыя нефартуннымі акалічнасцямі, беларусы застаюцца супольнасцю, вернай сваёй нацыі. Шкодзіць толькі слабасць дзяржавы – Рэспублікі Беларусі. Бо ад каго беларусы Беласточчыны маюць найменш падтрымкі, дык гэта ад суайчыннікаў.

"Наша ніва". 2003. 20 чэр.

Газета «Маланка» издаётся на личные средства Владимира Кузьмича Яковенко. Редакция выражает искреннюю благодарность Вам, Владимир Кузьмич, и надеется на долгосрочное сотрудничество.

Рэдакцыя: Алена Сіпакова, Алег Рудакоў.
Заснавальнік: ІТБК імя Яна Чэрскага.
Адрас Рэдакцыі: 664011, Расія, г. Іркуцк, вул. Чэхава, д.2
Тэлефон Рэдакцыі: (3952) 20-11-72
e-mail: malanka2000@mail.ru